**ВОДЗЫЎ**
на аўтарэферат дысертацыі
НЕНАДАЎЦА
Ягора Аляксеевіча
"ВОДНАЯ ПРАСТОРА Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ: СЕМАНТЫКА, СІМВОЛІКА, ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

Дысертацыйная праца Ненадаўца Я.А. мае актуальны характар, паколькі вада як адна з фундаментальных стыхій светабудовы займае важнае значэнне ў народнай культуры і заўсёды будзе заставацца надзённым прадметам даследавання фалькларыстаў і літаратуразнаўцаў. Вядомы французскі пісьменнік Антуан дэ Сэнт-Экзюперы пісаў: «Ты [вода] не просто необходима для жизни, ты и есть жизнь» («Планета людзей»); «Вода бывает нужна и сердцу...» («Маленькі прынц»). У культуры многіх народаў вада атаясамліваецца з першакрыніцай жыцця, якая ў славян была і застаецца сакральным прадметам шанавання. Фальклорны вобраз вады напоўнены семантычнай, сімвалісцкай шматмернасцю і ў той жа час этнакультурнай цэласнасцю.

Ступень навізны навуковых вынікаў у дысертацыйнай працы Ненадаўца Я.А. не выклікае сумнення, яна вызначаецца тым, што паглыбляе і ўдакладняе сучасныя веды па разнастайных аспектах духоўнага багацця беларускага народа, дае магчымасць "больш глыбока ўнікнуць у разуменне агульнай усходнеславянскай трансфармацыі сюжэтаў і матываў, дадаткова распрацаваць сістэму ўяўленняў народа пра пэўныя перыяды светабудовы і светаадлюстравання" (с. 3), паўней усвядоміць каштоўнасць нацыянальнага фальклору ў галіне гісторыка-духоўнай спадчыны беларусаў.

Абгрунтаванасць вывадаў забяспечана дакладным вызначэннем мэты і задач, аб'екта і прадмета даследавання. Дакладнасць вынікаў абумоўлена вялікай колькасцю прааналізаваных фальклорных крыніц, сістэмным падыходам да іх аналізу, выкарыстаннем шырокага спектру метадаў і прыёмаў даследавання. Вынікі дысертацыйнай працы выкладзены паслядоўна і лагічна, высновы глыбока абгрунтаваныя. Дысертацыя, як вынікае з аўтарэферата, апіраецца на грунтоўную тэарэтычную і метадалагічную базы і цалкам адпавядае сучаснаму накірунку гуманітарных даследаванняў. Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню атрыманых вынікаў пацверджаны сувяззю тэарэтычных палажэнняў работы з актуальнымі праблемамі фалькларыстыкі.

Аўтарэферат паказвае, што дысертацыя прайшла добрую апрабацыю і яе структура сведчыць аб канцэптуальным адзінстве работы, дзе ёсць і тэарэтычная частка, і раздзелы, у якіх разглядаюцца сацыяльна-гістарычныя прычыны і

напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх абрадаў і жанраў фальклору, звязаных з вадой; аналізуюцца фальклорныя жанры з воднай прасторай у складзе беларускіх абрадаў і сімвалічна-рытуальных дзеянняў; раскрываюцца адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускай народнай творчасці. Відавочна, што ў навуковай працы Ненадаўца Я.А. доказна абгрунтаваны тэарэтычныя катэгорыі і паняцці па заяўленай праблеме і вызначаны прынцыпы даследавання.

Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі саіскальніка ў тым, што яна прэзентуе шырокі культуралагічны кантэкст і грамадска-светапоглядны патэнцыял нацыянальнай фальклорнай спадчыны. Я.А. Ненадавец выяўляе вялікія эстэтычныя каштоўнасці нацыянальнага светаразумення і светасузірання, што павінна быць аптымальна запатрабавана ў сучаснай беларускай сацыякультурнай прасторы.

У цэлым знаёмства з аўтарэфератам па дысертацыі Ненадаўца Я.А. пацвярджае значнасць і сур’ёзнаць праведзенага даследавання, яго адпаведнасць усім неабходным патрабаванням, у тым ліку спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка. Лічу, што Я.А. Ненадавец заслугоўвае надання яму вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры беларускай і
замежнай літаратуры УА “Беларускі
дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка” Т.М. Тарасава

начальнік АК БДПУ
12. 12. 2023